УДК 821.161.3.09

# ПРАБЛЕМНА-ТЭМАТЫЧНАЕ КОЛА АПАВЯДАННЯЎ А. ВАСІЛЕВІЧ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Борбат Таццяна Іванаўна
загадчык кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый
установы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

Ячмянёва Ірына Мікалаеўна
дацэнт кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства
ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

*У артыкуле аналізуюцца апавяданні Алены Васілевіч для дзяцей, акрэсліваецца іх праблемна-тэматычнае кола.*

Таленавітая беларуская пісьменніца Алена Васілевіч прыйшла ў дзіцячую літаратуру ў 1950-я гады[1]. Паступова з-пад яе пяра з’яўляюцца апавяданні, адрасаваныя дзецям, яны склалі змест кніг “Заўтра ў школу” (1956), “Сябры” (1958), “Апавяданні”

[1] У 1947 г. у часопісе “Беларусь” была апублікавана аповесць А. Васілевіч “У прасторах жыцця”. У 1950 г выйшла з друку другая аповесць пісьменніцы “Шляхі-дарогі”, у якой паказаны маральная веліч і нязломнасць духу нашага народа ў гады вайны і той шчаслівы час, калі пачалося выгнанне захопнікаў з Беларусі. У аповесці “Шляхі-дарогі” выразна выявілася схільнасць да філасафічнасці, назіральнасць А. Васілевіч, і, што важна адзначыць, упершыню праявілася ўменне пісьменніцы перадаць своеасаблівасць дзіцячага свету.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(1959), “Калінавая рукавічка” (1963), “Шурка Рэмзікаў” (1985). Прытым ужо самыя першыя апавяданні пісьменніцы “сталі лепшымі здабыткамі беларускай дзіцячай прозы” [1, с. 232].

Творчая індывідуальнасць А. Васілевіч, тонкага лірыка, псіхолага, выявілася ў апавяданнях, прысвечаных праблеме ўзаемаадносін чалавека і прыроды (“Геша”, “Вожык”, “Бабуліны кватаранты”, “Цюлік”, “Браты-артысты”, “Мая гаспадарка”). Творы напоўнены любоўю да жывёльнага свету. А. Васілевіч стварае вобразы ўражлівых, рамантычных, назіральных дзяцей, што любяць і разумеюць прыроду, клапоцяцца пра птушак і жывёл, якія становяцца іх надзейнымі сябрамі. Так, у аснове апявядання “Геша” ляжыць гісторыя сяброўства дзяўчынкі Наты і гускі Гешы. Дзяўчынка і гуска навучыліся нават размаўляць і добра разумеюць адна адну.

Пісьменніца не намагаецца вышукваць шлях да сэрцаў дзяцей, кантакт з імі ў яе ўсталёўваецца лёгка і проста. Вось як, напрыклад, пачынаецца апавяданне: *“ – Гэта дзяўчынка? – Не. – Хлопчык? – Не. – А хто ж? – Гусяня. Гуска. – Раскажы. – Калі будзеш добры і паслухмяны, раскажу. – Буду. – Ну, тады слухай...”* [2, с. 8].

Геша – гуска, якую так празвалі дзеці за тое, што яна заўсёды прамаўляла “Ге! Ге!”. Толькі дабрыню спазнала Геша ад людзей: спачатку яны выратавалі яе маленькую, пакалечаную каршаком. Потым, калі набылі гуску іншыя людзі, каб падсмажыць на свята, пашкадавалі, здзіўленыя яе ласкавасцю; шукалі ўсім дваром. Вяртанню Гешы больш за ўсіх радавалася маленькая Ната.

У апавяданні “Браты-артысты” дзевяцігадовая дзяўчынка клапатліва адносіцца да маленькіх ягнятак, якія засталіся без маці, корміць іх з соскі, любоўна даглядае, песціць, размаўляе з імі, як са сваімі сябрамі. Гэтымі пачуццямі – спагадлівасцю, дабратой, душэўнай чуласцю – узбагачаюцца і чытачы. Эпізод, калі дзяўчынка ідзе каля школы, а ўслед, сочачы за кожным рухам сваёй гаспадыні, даверліва і весела бягуць ягняткі, з’яўляецца цэнтральным у творы. А колькі радасці прыносілі выступленні “артыстаў” перад школьнікамі! А. Васілевіч перака-нальна перадае пачуцці, што поўняць сэрца маленькай гераіні, той непаўторна светлы стан яе душы, які можна назваць толькі адным словам – шчасце. Аднак браты вырасл і ўжо *“не хацелі мяне пазнаваць. І мне было сумна…”* [2, с. 17].

Праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды асэнсоўваецца пісьменніцай і ў апавяданні-казцы “Калінавая рукавічка”. У творы А. Васілевіч выкарыстоўвае прыём антрапамарфізму. Красуня каліна, бяздомны вецер-сівер, дзяцел-бедалак, сава-паўночніца, руплівая вавёрка, старая яліна-казачніца – адухоўленыя вобразы, надзеленыя ўласцівымі чалавеку якасцямі. Напрыклад, каліна – прывабная, чулая, уражлівая, верная сваёй мясціне, дзе нарадзілася і вырасла. Сустракаючы ветра-бяздомніка *“маладзенькая каліна яшчэ больш чырванела і харашэла”*, але не згадзілася ляцець разам ветрам-сіверам, бо любіць свой лес: *“Я высахну і памру без свайго лесу”* [2, с. 7].

Так мовай вобразаў раскрыла А. Васілевіч у апавяданні-казцы “Калінавая рукавічка” філасофскую думку пра еднасць чалавека і **прыроды,** якую ён павінен берагчы як крыніцу незлічоных багаццяў і эстэтычнай асалоды. Важным для разумення філасофскай думкі аб еднасці чалавека са светам **прыроды** з’яўляецца эпізод сустрэчы каліны з хлопчыкам і ўсведамленне таго, што дарэмным быў страх каліны перад чалавекам, яно зразумела: *“ <…> ашукваў яе вецер і яліна-казачніца памылялася. Добрыя ў чалавека рукі, разумныя... <…>”* [2, с. 7-8]. Сустрэча з маленькім хлопчыкам нечаканая, а таму і асабліва незабыўная для дзяцей. Яны ўсхваляваныя гэтай сустрэчай не менш, чым сама прыгажуня-каліна, і бясконца рады, што хлопчык не пакрыўдзіў дрэўца, вярнуў яму веру ў чалавека. Гэтая ўсвядомленая радасць узбагачае душы дзяцей, выхоўвае дабрыню.

Кожны твор А. Васілевіч, прысвечаны тэме прыроды, філасафічны, змястоўны і пры гэтым зразумелы дзецям. У значнай ступені гэта тлумачыцца павышанай эмацыянальнасцю ўспрымання, характэрнай для пісьменніцы, непаўторным аўтарскім лірызмам.

Праблема ўзаемаадносін дарослых і дзяцей асэнсоўваецца пісьменніцай у апавяданні “Бабуліны кватаранты”. Мясцовыя хлапчукі адразу пацягнуліся сэрцам да нічым не прыкметнага рыбака і паляўнічага, бабулінага кватаранта, які прыехаў на некалькі дзён у вёску. З дзецьмі ён быў як з роўнымі, меў вельмі добрае сэрца. Калі бабуля купіла на рынку наравістага пеўня і хацела зварыць з яго крупнік, кватарант яго выратаваў і ўзяў пад сваю “апеку”, заявіўшы гаспадыні, што цяпер у яе будзе два кватаранты. З апавядання дзеці даведваюцца, што на сяброўства з чалавекам здатны нават певень. Певень пачаў наведваць пакой кватаранта. Завёўшы куранят ў хляўчук ускокваў у адчыненае акно і, нібы кацяня, размяшчаўся на коўдры ў нагах кватаранта. Калі ж бабулін кватарант пакінуў вёску і не ўзяў пеўніка з сабою, ён вельмі сумаваў: *“<…> некалькі дзён хадзіў пад зачыненым акном і ўсё некага здзіўлена клікаў <…> ”* [2, с. 42].

Тэме барацьбы беларускіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны прысвечана апавяданне А. Васілевіч з незвычайнай назвай “Партызанка Кніга”. Партызанка Кніга. Так назвалі ў партызанскім атрадзе кабылу, на лбе якой была белая плямка, падобная да разгорнутай кнігі. А партызанкай яе празвалі таму, што Кніга ўмела маскіравацца ў залежнасці ад сітуацыі, навучылася ляжаць нерухома і ступаць нягучна.

Самабытнасць таленту А. Васілевіч як дзіцячай пісьменніцы раскрылася і ў апавяданнях “Вернісаж”, “Чынгісхан”, “Я – унук капітана”, “Як я быў доктарам”, “Шурка Рэмзікаў”.

У апавяданні “Шурка Рэмзікаў” аб’ектам пільнай увагі А. Васілевіч становіцца сям’я, цесна звязаныя з ёю праблемы кахання, выхавання дзяцей, узаемаадносін паміж бацькамі і дзецьмі, лёсу асірацелых дзяцей. Шурка Рэмзікаў – герой аднайменнага апавядання – мае тры прывады ў міліцыю. За ім замацаваліся мянушкі “гультай” і “злодзей”. Нікога не цікавіць, як жывецца яму ў сям’і з айчымам, дзе, акрамя Шуркі, гадуюцца яшчэ трое малодшых братоў. Жыць побач з айчымам хлопчыку невыносна. *“Шурка не памятаў свайго роднага бацькі. Але ад маці і ад суседзяў ён ведаў, што бацька яго быў чалавек, якія рэдка трапляюцца: і разумны, і добры, і рукі меў залатыя... Бацька не вярнуўся з вайны. А айчым... Шурка ніколі не мог дараваць яму здзеку з бацькавай фотакарткі. Фотакартка гэтая вісела ў вялікай рамцы на сцяне. У першы ж тыдзень, перабраўшыся ў іхнюю хату, п’яны айчым разбіў рамку і, скамячыўшы, пачаў ірваць фотакартку яго бацькі”* [2, с. 68]. і малалетні Шурка ўцякае з дому... З таго дня пачаліся найбольшыя пакуты Шуркавай душы. Хлопчык адчувае сябе вельмі адзінокім, яму не хапае сяброўскай падтрымкі, парады. Нават маці, заўсёды занятая, стомленая, не зразумела гэтага.

Пісьменніца псіхалагічна тонка паказвае, што свет дзіцячай душы надзвычай складаны, а таму патрабуе асаблівай увагі, і перш за ўсё цеплыні, ласкі, добразычлівай патрабавальнасці. У складаным працэсе выхавання – і ў апавяданні гэта перака-нальна паказана – падлетак не проста аб’ект, а галоўная дзейная асоба. Ён абавязкова павінен сам змагацца за сябе, павінен прымусіць сябе пайсці тым шляхам, які патрабуе вялікай сілы волі, душэўнага напружання. Гэтая думка, данесеная да юных чытачоў хвалюючa і проста, стымулюе іх маральныя сілы, пераконвае ў неабходнасці самавыхавання. Пісьменніца паказвае безабароннасць дзіцячай душы, засцерагае дарослых ад чэрствасці і абыякавасці ў адносінах да дзяцей.

Цікавіць А. Васілевіч і тэма адказнасці дзіцяці за ўласныя ўчынкі. Пісьменніца пераконвае ў тым, наколькі важна знайсці сілы перанесці крыўду, правільна ацаніць свае ўчынкі. Не заўсёды ўдаецца гэта зрабіць своечасова, – адсюль і душэўны цяжар, і магчымая страта сяброў. Апавяданне “Сябры” – пра дружбу сапраўдную і ўяўную, пра сумленнасць і подласць, пра ўменне заўсёды заставацца надзейным сябрам. Школьнікі Грыша Міхневіч і Лёня Саўчанка – сябры. Аднак пасля кантрольнай па алгебры Грыша даведваецца, што яму, лепшаму вучню, паставілі чацвёрку, а Лёню – пяцёрку. Па дарозе дахаты сябры пасварыліся, і Грыша пакінуў Лёню, хлопчык адстаў і ледзьве не замёрз. Гэтая драматычная сітуацыя стала для Грышы сапраўдным маральным урокам.

Заўважым, што сюжэты некаторых твораў для дзяцей падказаны прыгодамі і здарэннямі, што адбыліся з дзецьмі самой пісьменніцы (“Геша”, “Цюлік”, “Арфа” і інш.). А.Васілевіч нават не змяніла імёны сына і дачкі – Вова, Наташа (Ната). У гэтых творах малы чытач знойдзе шмат гульняў, забаў, прыдумак, дзіцячых спрэчак.

Такім чынам, апавяданні А. Васілевіч для дзяцей вызначаюцца ідэйна-тэматычнай разнастайнасцю. Яны актывізуюць думкі дзіцяці, узбагачаюць яго пачуцці, выхоўваюць лепшыя маральныя якасці. Пісьменніца ўмее разглядзець шматлікія



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

колеры жыцця, аддаючы перавагу светлым, сонечным. Адсюль столькі замілавання да сваіх герояў, шчырай улюблёнасці ў жыццё. “Час не гасіць звабных іскрынак прыязнасці да людзей у вачах Алены Васілевіч. Яна заўсёды душэўная, прыветная, гатовая падтрымаць, прыйсці на дапамогу, падарыць чалавеку радасць, дружалюбства” [3, с. 15].

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. Борбат, Т. І. Алена Васілевіч / Т. І. Борбат, В. Б.Несцяровіч // Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А. М. Макарэвіч [і інш.] ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча. – Мінск : РІПА, 2016. – 359 с.
2. Васілевіч, А. Горкі ліпавы мёд : апавяданні : для мал. і сяр. шк. узросту / А. Васілевіч – Мінск : Маст. літ. , 2011. – 263 с.
3. Яфімава, М. Няхай не пакідае нас надзея!: Дыялог з А.Васілевіч / М. Яфімава // Роднае слова. – 1997. – №12. – С. 15–30.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова